# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» № 18 (студзень)*

# ШТО Ў ІМЕНІ ТВАІМ, ТАЦЦЯНА?





**25 СТУДЗЕНЯ -**
***Дзень студэнтаў***
***(Таццянін дзень)***



**Таццяна БУЛОЙЧЫК,**
**вучаніца 10 "Б" класа:**

*- Маё імя само па сабе прыгожае, лёгка запамінаецца, адпавядае мне. Падчас свята мяне віншуюць, дораць падарункі. Я ўдзячна тату за такое цудоўнае імя.*

**Таццяна РАТКЕВІЧ,**
**вучаніца 8 "В" класа:**

*- Маё імя дазваляе мне лёгка знаходзіць сяброў, паколькі яно простае для запамінання. Гэтае імя – падарунак матулі. Прыемна, што такое імяннае свята існуе і ёсць магчымасць адзначаць больш святочных дзён у годзе.*

**Таццяна КРУТАЛЕВІЧ,**
***вучаніца 11 "А" класа:***

*- Маё імя прыгожае і простае. Яно прыносіць мне ўдачу па жыцці. Ганаруся сваім імем, якім названа дзякуючы сваёй хроснай матулі. Таццянін дзень – сапраўднае свята: віншуюць, дораць падарункі, я адчуваю шчырасць сяброў і блізкіх. Гэта ўсё гаворыць аб тым, што мяне любяць і пра мяне клапоцяцца.*

**Таццяна ДАЎГУЧЫЦ,**
***вучаніца 10 "Б" класа:***

*- Імя мне выбралі бацькі, яны вельмі хацелі, каб у іх з'явілася дачка. Свята, якое адзначаецца штогод дваццаць пятага студзеня, мне вельмі падабаецца: прымаючы віншаванні, прыемна адчуваць клопат з боку родных і сяброў.*




# СТАЦЬ ВЫДАТНІКАМ: МРОІ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?

**1. Цяжкасці ў вывучэнні якіх прадметаў ты адчуваеш? Самыя любімыя з апошніх?**
**2. Тваё хобі, захапленне? Чым займаешся ў вольны час?**
**3. Кім плануеш стаць у будучым і чаму?**
**4. Хто, па тваім меркаванні, з'яўляецца паспяховым чалавекам?**
**5. Як стаць выдатнікам (раскажы пра свой шлях дасягнення гэтай мэты)?**

**1.** Я лічу, што калі ёсць асабістая цікавасць да вучобы, то цяжкасцю з'яўляецца адно - недахоп часу. Для наяўнасці ўсяго астатняга было б жаданне.
**2.** Гэты год для мяне вельмі важны. Гэта выніковы, апошні школьны год. Таму вольнага часу амаль няма, затое хапае перажыванняў. Вельмі важна ўмець сябе супакоіць, і вельмі важна ўмець за кароткі прамежак часу адпачыць і настроіць сябе на далейшую працу. У гэтым мне дапамагае жывая музыка. Я іграю на фартэпіяна, наведваю танцавальны гурток. Без руху жыццё немагчыма!
**3.** Планую стаць праграмістам. Чаму? Таму што мне вельмі падабаецца «ажыўляць» тое, што не мае ні сэрца, ні душы, ні эмоцый. Гэта нібы звышмагчымасць, размова з «жалезам». Так, і атрымліваецца нядрэнна, і прыносіць задавальненне.
**4.** Дакладна ведаю, што паспяховы чалавек - гэта той, хто ўмее даць ацэнку сваім учынкам, аналізаваць іх і рабіць правільныя высновы. Чалавек, які ніколі не страціць чалавечых якасцей, заўсёды застанецца верным сябрам, тым, хто любіць родных і шануе кожны момант свайго жыцця (памятайце, ён непаўторны!).
**5.** Напэўна, я вельмі адказны чалавек. І яшчэ ў пачатковай школе лічыла, што калі за нешта бярэшся, то трэба рабіць гэта добра. Не адняць у мяне маёй цікаўнасці. Кожная навука па-свойму цікавая. Шмат у чым гэта - заслуга маіх бацькоў. Яны змаглі прывіць з дзяцінства мне гэтую цікавасць да ўсяго. Заўсёды падабалася вучыцца, пазнаваць нешта новае.

## ІРЫНА ЕРАМІН

**1.** Складанасці ўзнікаюць пры вывучэнні фізікі. Мне падабаюцца такія прадметы, як руская і англійская мовы, хімія і фізкультура.
**2.** Мне падабаецца маляваць. Калі выдаецца свабодная хвіліна, напрыклад, на перапынку, я аддаю перавагу алоўку. У вольны час наводжу парадак і чысціню ў кватэры, хаджу з сябрамі ў басейн.




**3.** У будучым планую стаць добрым спецыялістам у галіне эканомікі. Буду прыкладаць усе намаганні, каб ведаць у сваёй прафесіі ўсё неабходнае і ўмець пераадольваць цяжкасці.
**4.** Паспяховы чалавек, у маім разуменні, - той, у каго атрымліваецца рашаць цяжкія жыццёвыя задачкі. Той, хто займаецца справай, якая падабаецца, той, хто лічыць сябе шчаслівым.
**(Працяг на стар. 4).**

# ЗАХАПЛЕННЕ ПІВАМ - НЕЗДАРОВЫ ВЫБАР

***Убачыць маладога чалавека з бутэлькай або бляшанкай піва ў руках - рэаліі сённяшняга дня. Для многіх піць піва - гэта модна, прыемна, яно стварае прыязную атмасферу, дапамагае адпачываць, расслабляцца ... Што ж на самой справе хаваецца за эпітэтамі, якімі ўзнагароджваюць гэты пенны напой яго аматары?***

## ПІВА - ЗУСІМ НЕ БЯСШКОДНЫ НАПОЙ

Піва - гэта алкагольны напой, выраблены з вады, ячменнага соладу, дражджэй і хмелю шляхам ферментатыўнага браджэння.

Колькасць этылавага спірту ў ім вагаецца ў залежнасці ад гатунку - ад 3-7% да 12%.

У працэсе браджэння ў піве ўтвараюцца пабочныя прадукты, якія валодаюць таксічнымі ўласцівасцямі. Іх колькасць у піве ў дзясяткі і сотні разоў перавышае ўзровень іх дапушчальнай канцэнтрацыі ў гарэлцы.

Алкаголь узмацняе таксічнае дзеянне кампанентаў піва, нават калі яны ўтрымліваюцца ў ім у вельмі малых колькасцях. Чым вышэй мацунак піва, тым агрэсіўней вядуць сябе атрутныя рэчывы.

## ЯК І ЎСЯКІ АЛКАГОЛЬНЫ НАПОЙ, ПІВА ВЫКЛІКАЕ АП'ЯНЕННЕ І ФАРМІРУЕ ЗАЛЕЖНАСЦЬ

Па шкодным уздзеянні на арганізм піва параўнаецца хіба што з самагонам.

Піўны алкагалізм хутка фарміруецца, цяжка паддаецца лячэнню.

Небяспеку ўяўляе таксама «безалкагольнае» піва, паколькі алкаголь у ім, хай нават у невялікай колькасці, але ўсё ж прысутнічае.

Не думай, што выпіць піва раз-два ў тыдзень - гэта нармальна. Такое стаўленне да піва вельмі небяспечна. Адна бутэлька 5% піва ў сярэднім роўная 50 гр. гарэлкі, а 9% піва - 100 гр. гарэлкі.

Чалавек, які выпівае на працягу дня літр-паўтара піва, прымае даволі вялікую дозу алкаголю - 100-300 гр.

Калі падлетак выпівае тры-чатыры разы на месяц - гэта ўжо злоўжыванне, і вельмі сур'ёзнае.

Да групы рызыкі адносяцца, перш за ўсё, падлеткі і маладыя людзі да 21 года, залежнасць ад алкаголю ў якіх фарміруецца ў 3-4 разы хутчэй, чым у дарослага чалавека.

## ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ ПІВА СУР'ЁЗНА ЎПЛЫВАЕ НА ЖЫЦЦЁВА ВАЖНЫЯ ОРГАНЫ І СІСТЭМЫ АРГАНІЗМА

Пакутуюць, перш за ўсё, сэрца і сасуды (піва выклікае расшырэнне вен і павелічэнне памераў сэрца; утрымлівае кобальт, што спрыяе развіццю сардэчнай недастатковасці; змяшчае рэчывы, якія правакуюць павышэнне артэрыяльнага ціску, выклікаюць галаўны боль, могуць прывесці да пашкоджання нырак.




Парушаюцца абменныя працэсы (парушэнне сардэчнага рытму, сухасць скуры, болі ў лытках, слабасць у нагах, раздражняльнасць, плаксівасць, дрэнны сон).

Назіраюцца эндакрынныя парушэнні, якія цягнуць за сабой сур'ёзныя змены ў рэпрадуктыўнай сферы (у мужчын становіцца шырэй таз, павялічваюцца грудныя залозы, у жанчын становіцца грубым голас, з'яўляюцца вусы; з-за таксічнага пашкоджання ў мужчын развіваецца бясплоднасць).

**(Працяг на стар. 4).**

# СТАЦЬ ВЫДАТНІКАМ: МРОІ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?

(Працяг. Пачатак на стар. 2).

**5.** Каб стаць выдатнікам, трэба быць адказным і цярплівым, бо нічога не даецца проста так. Толькі прыкладаючы намаганні, можна дасягнуць паспяховых вынікаў.



МАРЫНА ЛАПЦЁНАК

**1.** Цяжкасці ўзнікаюць з матэматыкай. Любімы прадмет - руская літаратура.
**2.** Хобі - маляванне. У вольны час люблю гуляць са сваёй малодшай сястрой.
**3.** На сённяшні дзень не маю адказу на дадзенае пытанне.
**4.** Паспяховы чалавек - гэта той чалавек, які дасягнуў сваёй мэты.
**5.** Старанна і заўсёды выконваю дамашнія заданні, уважліва слухаю на ўроках, галоўнае - не ленавацца!



КСЕНІЯ НЕСЦЯРОВІЧ

**1.** Усе прадметы даюцца мне лёгка. Самы любімы з іх – грамадазнаўства.
**2.** У вольны час я пляту фенечкі. Таксама люблю чытаць кнігі.
**3.** З якой прафесіяй будзе звязана маё жыццё, я пакуль не вызначылася дакладна. Магу сказаць толькі, што кірунак тэхнічны.
**4.** Паспяховы чалавек упэўнены ў сабе, таварыскі.
**5.** Каб стаць выдатнікам, павінна быць імкненне да ведаў, зацікаўленасць кожным прадметам і, вядома ж, цярплівасць.

**Юлія ПІСКУН.**

# ЗАХАПЛЕННЕ ПІВАМ - НЕЗДАРОВЫ ВЫБАР



(Працяг. Пачатак на стар. 3).

Клеткі печані паступова гінуць (яна зморшчваецца, губляе сваю ахоўную функцыю; ад цырозу печані часцей за ўсё паміраюць менавіта аматары піва!). Пакутуе нервовая сістэма (пагаршаецца памяць, слабее ўвага, парушаюцца разумовыя працэсы).

**ЗАПОМНІ!**

***Калі для вырашэння сваіх праблем ты звяртаешся па дапамогу да спіртнога (піва ў тым ліку), да старых праблем ты дадаеш новую - высокую рызыку развіцця алкагалізму, вылечыць які немагчыма!***

**ШТО РАБІЦЬ?**

***Праяві сілу волі.***
***Слухай голас розуму.***
***Не паддавайся ніякім спакусам адурманіць сябе.***
***Думай аб сваёй будучыні!***

# ШТО Ў ІМЕНІ ТВАІМ, ТАЦЦЯНА?

## У ГОНАР КАГО ВАС ТАК НАЗВАЛІ?

**Таццяна Мікалаеўна МАРТЫНЧЫК,**
***прыбіральшчыца*:**

- У гонар бабулі.

**Таццяна Сцяпанаўна ЧАРВЯКОВА,**
***кухонная рабочая*:**

- Імя Таццяна выбраў мне брат: яно яму падабаецца.

**Таццяна Мікалаеўна ШМАРЛОЎСКАЯ,**
***повар*:**

- Гэта імя, як і жыццё, мне падарыла матуля, бо яна лічыць яго прыгожым.

**Таццяна Васільеўна БАНДАРЧЫК,**
***выхавальнік групы падоўжанага дня*:**

- Маёй матулі падабаецца гэта імя, вось яна мяне так і назвала.

**Таццяна Мікалаеўна ФЯДОТАВА,**
***настаўнік пачатковых класаў*:**

- Мяне назвалі менавіта так, таму што я нарадзілася ў студзені.

**Таццяна Віктараўна ЛОГВІН,**
***настаўнік біялогіі*:**

- Выбар імені не быў звязаны з кімсьці. Яно вельмі падабаецца майму тату.

**Таццяна Анатольеўна МІРАНОВІЧ,**
***выхавальнік групы падоўжанага дня*:**

- Мяне так назваў тата.

## ШТО ПРЫНОСІЦЬ ВАМ ІМЯ Ў ЖЫЦЦІ?

**Т.М. МАРТЫНЧЫК:**

- Ёсць тры ўнучкі.

**Т.С. ЧАРВЯКОВА:**

- Ніколі над гэтым не задумвалася, магчыма, удачу.

**Т.М. ШМАРЛОЎСКАЯ:**

- Я лічу, што імя прыносіць поспех свайму ўладальніку.

**Т.В. БАНДАРЧЫК:**

- Думаю, шанцаванне.

**Т.М. ФЯДОТАВА:**

- Цвёрдасць і ўпэўненасць.

**Т.В. ЛОГВІН:**

- Маё імя мне падабаецца, і вельмі добра, што ёсць дадатковае свята ў годзе.

## ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ТАКОГА СВЯТА, ЯК ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ?

**Т.М. МАРТЫНЧЫК:**

- Гэты дзень я святкую. Дзеці віншуюць.

**Т.С. ЧАРВЯКОВА:**

- Добра, прымаю віншаванні.

**Т.М. ШМАРЛОЎСКАЯ:**

- Гэтае свята для мяне як другі дзень нараджэння.

**Т.В. БАНДАРЧЫК:**

- Я сустракаю гэты дзень з радасцю.

**Т.М. ФЯДОТАВА:**

- Мяне ўсе віншуюць у гэты святочны дзень.

**Т.В. ЛОГВІН:**

- Мяне заўсёды віншуюць, я атрымліваю міні-падарункі. Яшчэ гэты дзень лічыцца днём студэнта. Калі я была ў статусе вучаніцы, настаўнікі не задавалі шмат пытанняў падчас адказу.

**Т.А. МІРАНОВІЧ:**

- Мне падабаецца гэта свята, у асноўным у гэты дзень я атрымліваю кветкі. Сваякі і знаёмыя тэлефануюць і віншуюць.

# ПРАЗ СТАГОДДЗІ ДА ТРАДЫЦЫЙ



***КАЛЯДЫ - адзін з самых папулярных свят у беларусаў. Па хатах хадзілі калядоўшчыкі, што спявалі калядкі, вадзілі з сабой «казу», часам і «мядзведзя», якія разыгрывалі прадстаўленні каля кожнага двара, атрымліваючы за гэта розныя пачастункі і дробныя грошы.***

**(Працяг на стар. 8).**

# ЗІМОВЫЯ ПРЫГОДЫ

***Вось і скончыліся доўгачаканыя зімовыя канікулы. Кожны з вучняў распланаваў і правёў іх па-свойму: хтосьці вырашыў наведаць сваякоў, іншы прысвяціў вольны час сябрам, а хтосьці падарожнічаў. А чым запомніліся зімовыя канікулы вучням СШ № 2?***

**(Працяг на стар. 7).**

**Таццяна РАТКЕВІЧ:**

— Я ездзіла ў Мінск да цёткі, з якой мы разам наведалі Нацыянальную бібліятэку Беларусі і пабывалі ў асаблівым і вельмі прыгожым месцы - «Востраве Мужнасці і Смутку» (яшчэ яго называюць “Востраў Слёз”). Гэты зусім невялікі астравок знаходзіцца пасярод ракі Свіслач побач з Траецкім прадмесцем і акружаны вербамі, якія “плачуць” прама ў Свіслач. Трапіць на яго можна, прайшоўшы па невялікаму мастку. На востраве стаіць помнік «сынам Айчыны, якія загінулі за яго межамі». Помнік быў усталяваны ў 1996 годзе ў гонар загінуўшых воінаў-афганцаў. Гэта месца акружана сумнай рамантыкай, маладыя прыходзяць сюды аддаць даніну памяці загінуўшым хлопцам, прыносяць кветкі і згодна з традыцыяй жаніх пераносіць сваю нявесту на руках праз масток.



**Аляксандра САЙ:**

— Трэцяга студзеня я з бацькамі наведала Мінск-арэну, на якой было наладжана мерапрыемства Прадзюсарскага цэнтра братоў Запашных пад назвай “Цырк з іншай планеты”. Адным з асноўных нумароў фантастычнай праграмы была акрабатыка. Больш за ўсё мне запомніліся дзве іншапланецянкі, агульны рост якіх складаў каля чатырох з паловай метраў. Відовішчнае шоу зачароўвала сваёй прыгажосцю прысутных, у ліку якіх аказалася і я.



**Таццяна БУЛОЙЧЫК:**

— На зімовых канікулах я ездзіла ў Італію. Падчас падарожжа мне давялося наведаць Дуома ды Мілана, які называюць яшчэ кафедральным саборам. Ён размешчаны на галоўнай плошчы Мілана. Сабор з’яўляецца славутасцю горада. Ён аздоблены белым мармурам, упрыгожаны сотнямі вежаў, статуямі, а на вокнах яго адлюстравана мноства розных малюнкаў. Калі падняцца на дах Дуома, то адкрываецца цудоўны від на Мілан, а таксама можна больш дэталёва разгледзець элементы архітэктуры сабора.






**Эла КАРПОВІЧ:**

— Я здзейсніла падарожжа ў Галандыю, наведала Амстэрдам, Паўночнае мора. Мне вельмі спадабалася гасціннасць грамадства. Здзівілі мяне іх згуртаванасць і дружалюбнасць. Сям'я, у якой мне давялося гасцяваць, не стала выключэннем.

**Дар'я СІКІРЫЦКАЯ:**

— Я ездзіла ў Іспанію. Наведала мастацкі музей Прадо – адну з галоўных каштоўнасцей Мадрыда, які быў заснаваны ў 1819 годзе на аснове іспанскіх каралеўскіх і царкоўных калекцый. Цяпер жывапісная калекцыя музея налічвае больш за 8600 палотнаў. Новы год я сустрэла ў Барселоне. У Іспаніі прыгожыя плошчы, высокія пабудовы, смачная ежа, прыемныя людзі, што добра ставяцца да прыезджых. Захапіла мяне сваёй незвычайнай прыгажосцю і горная прырода.



# ЗІМОВЫЯ ПРЫГОДЫ

**Аляксандра СТАРАСЦЕНКА:**

— На апошнім вучэбным тыдні другой чвэрці мне давялося наведаць навагоднюе мерапрыемства "Галоўная ёлка краіны", якое было наладжана ў Палацы Рэспублікі горада Мінска. Увазе гледачоў быў прапанаваны спектакль. Перад паказам з прамовай выступіў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Ён выказаў падзяку людзям, на якіх можна спадзявацца ў будучыні, пажадаў прысутным поспехаў у вучобе і параіў абавязкова знаходзіць час для заняткаў спортам.

Падзеі спектакля разгортваліся вакол дзвюх дзяўчынак, якія хацелі трапіць у школу Мароза. Але ў гэтую школу прымалі толькі хлопчыкаў. Гераіням давялося пераапрануцца, каб стаць вучнямі дадзенай установы. Два гарэзлівыя хлапчукі вырашылі пажартаваць з дзяўчынак ды скрасці посах, без якога не пачалося б свята. На дапамогу дзяўчынкам прыходзіць добразычлівы эльф. Святочнае мерапрыемства не сарвалася, але тайна гераінь з пераапрананнем была раскрыта. Пасля ўсяго гэтага дырэктар школы вырашыў наладжваць ва ўстанове навучанне не толькі хлопчыкаў, але і дзяўчынак. Першыя выступалі ў ролі Марозаў, а апошнія – у ролі сняжынак.



(Працяг. Пачатак на стар. 6).

**Ксенія ГУРЭНЧЫК.**

# СТУДЗЕНЬСКІ КАЛЕЙДАСКОП



## «ЦУДЫ ПАД НОВЫ ГОД»

***Вучні СШ № 2 разам з настаўніцай пачатковых класаў Таццянай Мікалаеўнай ФЯДОТАВАЙ, якая ўпэўнена, што мерапрыемствы такога кшталту выхоўваюць любоў да Радзімы і пашыраюць кругагляд вучняў, 30 снежня наведалі галоўную ёлку краіны, навагодні кірмаш і плошчу Незалежнасці. Пасля ўсяго названага вучні разам з педагогам завіталі ў канцэртную залу горада Мінска на спектакль “Цуды пад Новы год”. Задаволеныя дзеці з захапленнем глядзелі пастаноўку… Кожнаму з іх нешта спадабалася… А што іменна, яны паведамяць нам самі…***

**Ілья СТАРАВОЙТАЎ:**

- Самым цудоўным у казцы было тое, што дабро, як заўсёды, перамагло зло.

**Косця ВАЙЦЯХОВІЧ:**

- Мне спадабаліся гульні пасля спектакля. Віктарыну праводзіла цётка Скрыпка. Мы спявалі, танцавалі і ўдзельнічалі ў конкурсах, пасля чаго нас частавалі цукеркамі.

**Ягор ГУСЕВІЧ:**

- Самым дзіўным было з’яўленне Дзеда Мароза.

**Таццяна ФЕДАРЫНЧЫК:**

- Мне больш за ўсіх астатніх герояў спадабалася Снягурка. Такая прыгожая і добрая яна была.

**Алена ЦЭНКЕЛЬ.**

## ПРАЗ СТАГОДДЗІ ДА ТРАДЫЦЫЙ

Гэтая традыцыя не абышла і вучняў нашай школы. З ідэяй правядзення калядак выступіла Маргарыта БОНДАР. Яна з’яўляецца студэнткай Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і на той час праходзіла практыку на базе нашага раёна. Маргарыта - творчы чалавек, з дзяцінства займаецца спевамі, танцамі, з задавальненнем вывучае творчую спадчыну беларускага народа. Дзяўчына не ўпершыню распрацоўвае сцэнарыі і праводзіць розныя мерапрыемствы. Так, свята «Новы год» пакінула ў душы многіх вучняў нашай школы прыемныя ўспаміны.

Падрыхтоўкай да «Каляд» Маргарыта занялася яшчэ ў снежні. Акцёрскі склад (вучні 6-9 класаў) быў падабраны на падставе назіранняў за выхаванцамі падчас навагодняга прадстаўлення, дзе вучні паказалі свае акцёрскія і музычныя здольнасці. Рэпетыцыі праходзілі ў час канікул. Дзеці з захапленнем працавалі над сваімі ролямі. І гэта дало вынік. Так, 13 студзеня творчая група з праграмай «Каляда, Каляда» наведала Аддзел па нарыхтоўках сельгаспрадукцыі і сыравіны. Ніводнага з прысутных дадзенага прадпрыемства не пакінулі абыякавымі «каза» ў выкананні Вікторыі ЛАПЦЁНАК, Ілья ЕРМАЛОВІЧ у ролі “дзеда”, «цыган» Антона ПАНЦЮХОВА, «гаспадар» Мікіты СЯМАШКІ і інш. Калядныя песні, запальныя танцы, жарты і гульні выклікалі ў гледачоў масу станоўчых эмоцый. Як і належыць, згодна з народнымі традыцыямі, калядоўшчыкі былі абдораны пачастункамі.

**(Працяг. Пачатак на стар. 5).** **Юлія ПІСКУН.**